ВЯРТАННЕ ПАМЯЦІ:

МЕМАРЫЯЛ «КАНЦЛАГЕР ДАХАУ» ПРОСІЦЬ ДАПАМАГЧЫ ЎСТАНАВІЦЬ ІМЁНЫ АХВЯР

За два кіламетры ад асноўнага лагера Дахау ў 1941—1942 гадах было забіта звыш чатырох тысяч савецкіх ваеннапалонных. Сёння на тэрыторыі расстрэльнага поля створаны музей пад адкрытым небам, які распавядае пра здзейсненыя злачынствы. У цэнтры экспазіцыі — біяграфіі асобных ахвяр. Але гісторыя тых падзей яшчэ працягвае ствараццa — супрацоўнікі музея па крупінках збіраюць інфармацыю, вышукваюць імёны, спрабуюць ідэнтыфікаваць ахвяр, просяць адгукнуцца сведкаў ці сваякоў забітых.

Побач з асноўнай экспазіцыяй — прытопленыя ў зямлю пліты, размешчаныя такім чынам, каб паказаць месца забойства і нагадаць, што падчас расстрэлаў ахвяр выстройвалі ў шарэнгі па пяць чалавек. На плітах — таблічкі, на якіх кірыліцай і лацінкай пазначаны прозвішчы забітых, даты іх нараджэння і смерці. На цяперашні момант удалося ўзнавіць імёны толькі каля васьмі соцень ахвяр... Але супрацоўнікі мемарыяла не спыняюць даследаванняў і спадзяюцца, што экспазіцыя будзе дапаўняцца новымі стэндамі і, самае галоўнае, што будзе вернута памяць: сваякі, якія лічылі сваіх дзядоў, бацькоў, братоў «зніклымі без вестак» падчас Другой сусветнай вайны, нарэшце змогуць даведацца пра іх лёс.

Загад аб камісарах

«Яшчэ да нападзення нацысцкай Германіі на Савецкі Саюз, 6 чэрвеня 1941 года, быў выдадзены так званы «Загад аб камісарах», са зместам якога былі азнаёмленыя ў вусным парадку ўсе нямецкія дывізіі. Сутнасць яго была ў тым, што палонных камісараў і палітрукоў належала адразу расстрэльваць. Ну і яўрэяў, натуральна, таксама. Сярод ваеннапалонных звесткі аб расстрэлах распаўсюдзіліся вельмі хутка, таму палітычныя кіраўнікі і яўрэі стараліся схавацца пад выдуманымі імёнамі», — расказвае каардынатар праекта Андрэа Рыдле.

Многім сапраўды на некаторы час удалося затаіцца. Але нацысты прадбачылі такую сітуацыю. Пры вялікай колькасці ваеннапалонных (а да сярэдзіны жніўня 1941 года ў германскім рэйху іх было ўжо больш за 150 тысяч) гэта стварала небяспечную сітуацыю, існавала верагоднасць, што афіцэры змогуць арганізаваць супраціўленне ў лагерах. Пачалося паляванне на «ідэйна шкодных элементаў», у час якога пацярпелі не толькі афіцэры і яўрэі, але і палонныя, якіх палічылі падазронымі («прафесіянальныя рэвалюцыянеры», «бунтаўшчыкі», асобы, якія спрабавалі ўцячы, і проста інтэлігенцыя, маўляў, апошняя таксама здольная ўзняць людзей на бунт). Сартавалі ахвяр спецыяльныя айнзацкаманды (часцей за ўсё яны складаліся з прадстаўнікоў гестапа). Каменданты лагераў выдзялялі баракі для правядзення допытаў, адгароджаныя тэрыторыі для адсартаваных і пры неабходнасці ўзброены канвой для суправаджэння.

Магчыма, вы іх ведаеце...

Так званых непрымальных палонных адпраўлялі на знішчэнне ў найбліжэйшыя канцэнтрацыйныя лагеры. Побач з Дахау знаходзіўся лагер для палонных афіцэраў. Палігон СС Хебертсгаўзен, дзе сёння створаны мемарыял, стаў месцам найбольш масавых расстрэлаў асоб, адсартаваных згодна з «Загадам аб камісарах». На жаль, менавіта такой катэгорыі ахвяр, як ваеннапалонныя, у ранейшыя часы ўдзялялася недастаткова ўвагі. Але нават сёння, калі пасля тых жахлівых падзей мінула ўжо больш за сем дзесяцігоддзяў, яшчэ многае можна зрабіць для таго, каб увекавечыць памяць пра гэтых людзей.

Зразумела, ніякіх расстрэльных спісаў не існавала, трупы крэміраваліся — нацыстам неабходна было схаваць сляды злачынстваў. Але тым не менш знайсці інфармацыю пра знішчаных чырвонаармейцаў можна. Справа ў тым, што на кожнага савецкага ваеннапалоннага заводзіліся персанальныя карткі, у якіх пазначаліся прозвішча, год і месца нараджэння, а таксама адрас і прозвішча сваякоў, якіх варта было б праінфармаваць пра лёс ваеннапалоннага, напрыклад, пра яго гібель.

Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны такія дакументы трапілі ў розныя архівы (на сённяшні дзень некаторыя з іх ёсць у адкрытым доступе ў інтэрнэце, нешта ўдалося адсканаваць з закрытых архіваў) і даследчыкі музея-мемарыяла «Канцлагер Дахау» сталі працаваць з гэтай крыніцай.

Але ўзніклі праблемы з ідэнтыфікацыяй: некаторыя з ваеннапалонных маглі рэгістравацца пад прыдуманымі імёнамі. Не заўсёды пасля выяўлення сапраўдных прозвішчаў немцы іх выпраўлялі, але адрас і прозвішчы сваякоў, пазначаныя ў персанальных картках, як правіла, падаваліся сапраўдныя. І сёння, каб аднавіць і ўвекавечыць імёны ахвяр, супрацоўнікі музея-мемарыяла Дахау просяць адгукнуцца сваякоў расстраляных афіцэраў.

На сайце «Звязды» апублікаваны поўны спіс людзей, інфармацыю пра якіх спрабуюць адшукаць даследчыкі на тэрыторыі нашай краіны. Вось толькі асобныя з іх. Учытайцеся ўважліва, можа, сярод іх ёсць вашы блізкія.

Ст. лейтенант Абрамович Максим Адамович, 1906 г.р. Д. Негновичи Борисовский р-н Минская область, попал в плен в июне 1941 Алитус, содержался в офлаге XIIID, передан гестапо Нюрнберг 16.02.1942. Родственники: Адамович А.П. ул. Милицейская д. 7 г. Чаусы Могилевская область.

Лейтенант Казаков Иван Иосифович, 1918 г.р. Д. Паломка Могилевская область, попал в плен в июле 1941 вокзал Негорская, содержался в офлаге XIIID, передан гестапо Нюрнберг 27.01.1942. Родственники: Ковалева Анна, д. Паломка Костюковичский район Могилевская область.

Мл. политрук Астапов Василий Семенович, 1916 г.р. г. Гомель, попал в плен в июне 1941, место пленения неизвестно, содержался в офлаге XIIID, передан гестапо Нюрнберг 10.09.1941. Родственники: Астапов Семен, г. Гомель, ул. Мильчанская д. 3а.

Ст. лейтенант Егоров Федор Васильевич, 1909 г.р., Горьковская область, попал в плен в июне 1941 место пленения неизвестно, содержался в офлаге XIIID, передан гестапо Нюрнберг 05.11.1941. Родственники: д. Малиновка Руденский район Минская область.

Красноармеец Ольшанский Владимир Ефимович, 1916 г.р. г. Рогачев, попал в плен в июле 1941 Минск, содержался в шталаге VA, передан гестапо Штутгарт 26.01.1942. Родственники проживали в г. Рогачев. ул. Бобруйская.

Красноармеец Сазанов Сергей Федорович, 1914 г.р. г. Ардатов, попал в плен в июне 1941 г. Барановичи, содержался в шталаге VC, передан гестапо Дахау 10.08.1942. Родственники: ул.Фрунзе 38, ст. Пуховичи Минская обл.

Спіс мы друкуем на рускай мове — у тым выглядзе, у якім ён быў прадстаўлены ў рэдакцыю. Заўважым, што нямецкія даследчыкі самастойна перакладалі прозвішчы ахвяр расстрэлаў з лацінкі на кірыліцу. Да таго ж усе звесткі сабраны ў 1941 годзе, калі савецкіх ваеннапалонных бралі на ўлік, заводзілі на іх анкеты. Таму тут могуць сустракацца недакладнасці ў падачы прозвішчаў і назваў населеных пунктаў.

Поўны спіс — на сайце zviazda.by. Калі знайшлі ў ім кагосьці знаёмага — патэлефануйце або напішыце ў рэдакцыю.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

■ Валянцінкай

З ТАГО СВЕТУ

...Яблыні дзед Архіп садзіў каля вуліцы, прычым прынцыпова: казаў, што гэта — добрае месца.

На той час — і сапраўды, відаць: машын у вёсцы амаль не было — ні сваіх, ні чужых, а вось людзей — многа. І ўсе, на думку дзеда, харошыя. «Вось будуць міма нашай хаты ісці, — разважаў гаспадар, — і па яблычку сарвуць альбо апалы падымуць ды пачастуюцца. Глядзіш — добрым словам успомняць».

І бярозавы сок ён заўсёды збіраў: слоікамі, вёдрамі цягаў у склеп, зліваў у велікаватыя бочкі, дабаўляў трохі цукру, сухога хлеба і вінаграду — пакідаў брадзіць. Каб потым, у летнюю спёку, насіць гатовы прадукт не столькі сабе ў хату — каб людзей частаваць: прыпыняць на той жа вуліцы, перакідвацца слоўцам-другім, а нарэшце казаць: «Пастой, браток (ці сястрыца...), у мяне ж бярозавік ёсць. Мігам прынясу».

Паабяцаўшы, дзед і сапраўды спрытна «занырваў» у досыць глыбокі склеп, набіраў у кубкі халоднага квасу: піў, вядома ж, і сам, але конча з некім, бо «адзін ты з'еш хоць вала, адна і хвала».

Гэтае правіла жыцця дзед даводзіў спачатку дзецям — і сваім, і чужым, потым унукам ды ўнучкам, адна з якіх — самая «малая» і ўжо гараджанка, прыняўшы ў спадчыну хату, з сёлетняй вясны па выхадных прыязджае з сям'ёй у дзедаву вёску — прыглядае за садам, разводзіць кветкі, вучыцца вырошчваць што-нішто з гародніны, як некалі з дзедам, ходзіць у блізкі лес.

...Вось і надоечы з грыбамі адтуль вярталася. Не сказаць, каб шмат назбірала, але, убачыўшы на лаўцы суседку-бабулю, прыпынілася: павітаўшыся, спытала (хоць магла і не пытаць, бо ведала...):

— Цётка Мар'я, вы ж у грыбы не ходзіце? Дык падстаўляйце фартух, я вам трохі насыплю.

— Не, Светачка, не трэба, — стала бараніцца бабуля (фартух між тым ужо падстаўляючы). — Я — абыдуся. А ў цябе ж і муж ёсць, і дзеці — нясі сваім.

Свае — муж і пагодкі-дочкі — пакуль што спалі, але ж хутка маглі прачнуцца, прыйсці ў кухню снедаць. Таму гаспадыня адразу ж уключыла ў разетку чайнік, развяла міску цеста, узялася пячы бабуліны бліны. І ўжо там, ля пліты (мазгі ж не тэлевізар, іх не выключыш), міжволі ўспамінаць свой ранішні паход: думаць, як з гадамі «псуецца», зарастае хмызняком іх лес (а смеццем — сцежкі ды ўзлескі), як — вочы б не бачылі! — «шарэюць» ад сумніку пазакіданыя гароды, а самае балючае — як хутка старэюць і адыходзяць людзі... Тую ж цётку Мар'ечку ўзяць. Яе Палятушкай некалі звалі, бо яна, адна гадуючы дзяцей, і сапраўды не хадзіла — птушкай лётала, а вось зараз зранку сядзіць на лаўцы...

Зрэшты, не (Света праз акно зірнула на вуліцу): зараз таксама некуды «ляціць» — з кійком, але ж гэтак хутка...

«Да нас? Чаго? — здзівілася Света і ўміг спахмурнела. — Няўжо за грыбы мне дзякаваць будзе? Яшчэ чаго не хапала!»

Бабуля між тым ужо адчыняла дзверы, з парога занепакоена пытала:

— Ты не грыбочкі смажыш?

— Не, што вы... Яны яшчэ неперабраныя стаяць. Рукі не дайшлі, — далажыла Света. — На сняданак будуць бліны са смятанай.

— Вось і добра, што не з грыбамі... Давай мы разам на іх паглядзім, бо ты, дзіцятка, трохі воўчых прынесла...

— Не можа быць! Мне ж дзядуля ўсе паказваў. Я незнаёмых не брала.

— А яны цяпер так «маскіруюцца» — не разбярэш. Але ж гэта во, — дастаўшы грыб з кішэні, паказала бабуля, — белая паганка. І апенек вось гэтых людзі не ядуць.

...Света выключыла пліту (ужо не да бліноў было), разам з суседкай, у чатыры рукі, яны хутка перабралі-перагледзелі ўсе грыбы і знайшлі сярод іх яшчэ тры неядомыя.

Для таго каб (крый бог!) атруціць сям'ю, хапіла б, кажуць, і аднаго.

...Чым аддзячыць бабулі за тое, што перасцерагла, уратавала ад бяды, — Святлана не ведала.

Як не ведала яна і таго, чым жа аддзячыць... дзеду — за яго крылатае «адзін ты з'еш хоць вала, адна і хвала».

Валянціна ДОЎНАР.

***P. S.** Сярод любімых дзедавых прыказак была, дарэчы, яшчэ адна. Даводзячы некаму з халастых ці незамужніх, што трэба жаніцца, што ў сям'і — ці хоць бы ў пары — лепей век пражывеш (пра алкаголікаў ды наркаманаў тады ў вёсцы не чулі), дзед казаў, што чалавеку, вядома ж, добра аднаму... Але толькі ў прыбіральні.*

***P. P. S.** А яблыні яго — тыя, пры самай вуліцы — усё яшчэ растуць.*

І яблыкі на іх па-ранейшаму смачныя!

Гэта вам хто хочаш скажа, бо ў акрузе няма, здаецца, людзей, якія (нават маючы сады) дзедавых не каштавалі б.

Даты Падзеі Людзі

1 ЛІСТАПАДА

1868 год — нарадзіўся (в. Казьяны, цяпер у Шумілінскім раёне) Дзмітрый Іванавіч Даўгяла, беларускі гісторык, архівіст, археограф. З 1897 года — архіварыус Віцебскага цэнтральнага архіва старажытных актаў, затым — член Віленскай археаграфічнай камісіі. Рэдактар «Записок Северо-Западного отдела Русского географического общества», ганаровы член Віцебскай вучонай архіўнай камісіі. З 1925 года — супрацоўнік Інбелкульта, дацэнт БДУ, дырэктар бібліятэкі АН Беларусі. Вывучаў гісторыю беларускіх гарадоў і мястэчак, гісторыю нацыянальных меншасцяў у Беларусі, абарончыя збудаванні краіны. Публікаваў помнікі беларускай дзелавой пісьменнасці. Укладальнік і рэдактар «Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў», удзельнічаў у выданні «Актаў Віленскай камісіі», «Археаграфічнага зборніка дакументаў». Адзін з укладальнікаў «Гісторыі Беларусі ў дакументах і матэрыялах» і інш. Памёр у 1942 годзе.

1903 год — нарадзіўся Дзмітрый Фаміч Філімонаў, партыйны і дзяржаўны дзеяч Беларусі. У 1955—1957 гадах — першы сакратар Гомельскага абкама КПБ, у 1957—1968 гадах — сакратар і член Бюро ЦК КПБ, у 1962—1964 гадах — старшыня бюро ЦК КПБ па кіраўніцтве прамысловасцю і будаўніцтвам. Памёр у 1978 годзе. Яго імем названа вуліца ў Мінску.

1903 год — нарадзіўся (в. Лабковічы, цяпер у Крычаўскім раёне) Кузьма Венядзіктавіч Кісялёў, дзяржаўны дзеяч Беларусі, дыпламат, кандыдат медыцынскіх навук. З 1937 года — наркам аховы здароўя БССР, у 1938—1940 гадах — старшыня СНК БССР, у 1946—1966 гадах — міністр замежных спраў Беларусі. Меў ранг Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла. На чале дэлегацыі БССР у 1945 годзе на канферэнцыі ў Сан-Францыска падпісаў Статут ААН, у 1947 годзе па выніках Парыжскай мірнай канферэнцыі (1946) — мірныя дагаворы БССР з Балгарыяй, Венгрыяй, Італіяй, Румыніяй і Фінляндыяй. Узначальваў дэлегацыі БССР на сесіях Генеральнай Асамблеі ААН у 1946—1965 гадах. Памёр у 1977 годзе.

1908 год — нарадзілася (г. Мінск) Яўгенія Эргардаўна Пфляўмбаўм, беларуская паэтэса. З 1930 года працавала ў Кніжнай палаце пры Дзяржаўнай бібліятэцы Беларусі імя Леніна, у газеце «Звязда». У 1933-м выехала ў Сібір за сваім рэпрэсаваным мужам паэтам М. Лужаніным. З 1945 года жыла ў Мінску. Аўтар паэтычных зборнікаў «Сувой жыцця», «На захадзе сонца». Перакладала з англійскай — Джорджа Байрана і Джэка Лондана, і з рускай — прозу і драматургію Антона Чэхава і Максіма Горкага. Памерла ў 1996 годзе.

1512 год — Мікеланджэла Буанароці завяршыў роспіс зводу Сікстынскай капэлы — адной з найважнейшых парадных залаў Ватыкана.

1798 год — нарадзіўся Бенджамін Лі Гінес (1798—1868), ірландскі піваварі першы лорд-мэр Дубліна. Сёння піва Guinness вядома ва ўсім свеце.

1990 год — у адпаведнасці з указам Прэзідэнта СССР М. С. Гарбачова ў Савецкім Саюзе быў уведзены камерцыйны курс рубля да замежных валют (да таго адзін амерыканскі долар каштаваў 50,54 капейкі).